# МАНДАЛІНА — ПРАЗ СТАГОДДЗІ...

Ларыса Таірава

*Частка I*

ВЯРНУЛАСЯ З НЕБЫЦЬЦЯ...

Два гады назад пры Саюзе музычных дзеячаў была створана Асацыяцыя беларускіх дамрыстаў і мандалiністаў. Яе мэта — захаваньне традыцый народнаінструментальнай культуры, адраджэньне яе страчаных пластоў, разьвіцьцё і распаўсюджваньне домрава-мандаліннага мастацтва ў Беларусі. У выніку дзейнасьці Асацыяцыі мандаліну пачалі вывучаць у некаторых музычных установах, усё часьцей яе пяшчотны голас можна пачуць на канцэртных пляцоўках, і, бадай, самае галоўнае: у апошні час зьявіліся вельмі цікавыя калектывы як домрава-балалаечнага, так і мандалінна-гітарнага складу.

Адной з прыкметных падзей апошняга часу стала навукова-практычная канферэнцыя, прысьвечаная адраджэньню і разьвіцьцю мандаліннага выканальніцтва ў Беларусі, якую арганізавала Асацыяцыя сумесна з Саюзам музычных дзеячаў і Інстытутам праблем культуры. Яе ўдзельнікамі былі самыя розныя прадстаўнікі музычнай грамадскасьці: выкладчыкі навучальных устаноў, вядомыя музыканты, выканаўцы, маладыя дасьледчыкі. Новая справа пракладае сабе шлях у вельмі складаных умовах, калі культура перажывае цяжкі перыяд, таму ўдзельнікі канферэнцыі горача, з вялікай адказнасьцю абмяркоўвалі набалелыя пытаньні, якія патрабуюць свайго вырашэньня.

Добра вядома, што на мяжы 19-га—20-га стагоддзяў мандаліна была адным з самых папулярных і любімых інструментаў на тэрыторыі Беларусі. Пра гэта сьведчылі выступленьні многіх дакладчыкаў на канферэнцыі, а таксама ўспаміны былых удзельнікаў неапалітанскіх аркестраў. Так, выкладчык Мінскага вучылішча мастацтваў **Н. Мяркулава** паведаміла, што ў даваенны час толькі ў Мінску існавала 5 неапалітанскіх аркестраў, з іх 2 былі чыста жаночыя. Многія нашы вядомыя музыканты, кампазітары калісьці гралі на мандаліне: Р. Пукст, Я. Глебаў, Р. Шырма, Р. Сурус і інш. Мандаліна знайшла адлюстраваньне ў некаторых гістарычных помніках, у творах вядомых мастакоў. Дастаткова згадаць карціну «Дзяўчына з мандалінай» вядомага беларускага мастака М. Шагала, напісаную ў віцебскі перыяд яго творчасьці.



**На сцэне — Мікалай Марэцкі і Натальля Ручымская.**

Адзін са старэйшых выкладчыкаў вучылішча мастацтваў, **Л. Саламонік,** расказаў аб тым, што сваю музычную дзейнасьць да вайны ён пачаў у аркестры неапалітанскага тыпу пад кіраўніцтвам Лібермана, які працаваў у Віцебску. Цікавыя зьвесткі пра ўласную дзейнасьць у якасьці ўдзельніка, а потым кіраўніка неапалітанскага аркестра ў Віленскай гімназіі паведаміў аўдыторыі былы старшы выкладчык Беларускага педагагічнага універсітэта **Л. Фёдараў.**

Даклад выкладчыка Мазырскага музычнага вучылішча **А. Закрэўскага** літаральна ўзрушыў аўдыторыю. У 1981 годзе ім была прадпрынята экспедыцыя ў Гомельскую вобласьць з мэтай выяўленьня выканаўцаў-мандалiністаў. Усяго за 4 дні А. Закрэўскі сабраў багацейшы матэрыял, выявіў 20 мандалiністаў-аматараў і запісаў ігру 5 музыкантаў, сярод якіх сапраўдны віртуоз-самародак Яфім Пішчанскі (нар. 1914) з вёскі Хальч Веткаўскага раёна, таксама Ф. Бялоцкі (нар. 1923) з пасёлка Чапаеўскі Лельчыцкага раёна, С. Бандарэнка (нар. 1920) з Рэчыцы і інш. На думку маладога дасьледчыка, жыцьцястойкасьць мандаліны ў той час была невыпадковай: «Мандаліна больш, чым які-небудзь іншы інструмент, спалучае ў сабе разнастайныя якасьці розных інструментаў. Па дыяпазону мандаліна падобная на цымбалы, скрыпку, гудок, балалайку і часткова — на гармонік і гітару. Па тэхнічных магчымасьцях яна не саступае амаль ніводнаму інструменту. На ёй выконваюцца розныя віртуозныя пасажы, пераборы, акорды, трэмала. Мандаліна можа і саліраваць, і акампаніраваць і тым самым задаволіць запатрабаваньні як аматараў, так і прафесійных музыкантаў. Яна простая ў навучаньні, настройцы і рамонце...»

Чаму ў сярэдзіне нашага стагоддзя пачала зьнікаць мандаліна? Адказ на гэтае пытаньне можна было пачуць у выступленьні прафесара БелАМ **Г. Асмалоўскай:** «Менавіта ў гэты час, калі зьмянілася палітыка Масквы ў адносінах да народных інструментаў, як у Расіі, так і ў Беларусі спынілася навучаньне ў музычных школах на такіх «іншаземных» інструментах, як акардэон, мандаліна. Забараняўся таксама «заходні» саксафон. Калі не стала дзяржаўнай падтрымкі, пачалі зьнікаць мандалінныя аркестры і ансамблі. Але, нягледзячы на тое, што цікавасьці да мандаліны як быццам не было, многія аматары захавалі любоў да гэтага інструмента». Названа адна з асноўных прычын, але ёсьць іншы погляд на гэта пытаньне. Заслужаны работнік культуры прафесар БелАМ **М. Солапаў** лічыць, што домра, як больш дасканалы інструмент, пачала выцясьняць мандаліну. Такая думка прасочвалася і ў выступленьнях іншых удзельнікаў канферэнцыі, напрыклад, студэнта V курса БелАМ **А. Арабея:** «Домра без мандаліны на Беларусі можа існаваць, а вось мандаліна без домры — не...»

Слухаючы прамоўцаў, я міжволі думала пра тое, што інструменты, якія маюць такую багатую гісторыю і нібыта нарадзіліся наноў, не могуць загінуць ці зьнікнуць, нягледзячы на ўсялякія забароны, бо зараз належаць не толькі Беларусі ці Італіі: яны ўжо належаць усяму сьвету, людзям, якія іх любяць, іграюць на іх, захапляюцца імі. Яскравае пацьвярджэньне гэтаму — шмат-

**Неапалітанскі аркестр створаны! Яго прадстаўляе гледачу Валерый Жывалеўскі.**



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



Дырыжор аркестра «Менск» Генадзь Новікаў.

лікія аркестры народных інструментаў (АРНІ) ва ўсім сьвеце: дастаткова прыгадаць АРНІ ў Аўстраліі (Сіднейскі домравы аркестр), у ЗША (Філадэльфійскі балалаечны аркестр імя Андрэева), аматарскі АРНІ Осла (Нарвегія) і многія іншыя.

У час канферэнцыі былі ўзьняты розныя надзённыя пытаньні, якія патрабуюць неадкладнага вырашэньня. Перш за ўсё — гэта інструментарый. Нідзе на Беларусі ні мандалін, ні домр не выпускаюць (ды хіба ж толькі іх?). Раней мы мелі магчымасьць набываць неабходныя інструменты на фабрыках імя Луначарскага ў Санкт-Пецярбурзе ці ў Маскве, зараз жа на гэтыя фабрыкі спадзявацца ўжо не даводзіцца. Таму неабходна тэрмінова наладзіць выпуск гэтых інструментаў у нас, у Беларусі. Магчыма, зрабіць заказ на Барысаўскай фабрыцы або прыцягнуць да гэтай справы скрыпічных майстроў-адзіночак. Інакш кажучы, тут не абысьціся без афіцыйнай падтрымкі ўлад.

Другая не менш балючая праблема — рэпэртуар, выданьне і распаўсюджваньне нотнай літаратуры. Справа ў тым, што арыгінальнай літаратуры для мандаліны вельмі мала і зусім яе няма для ДМШ. Удзельнікі канферэнцыі прапанавалі некалькі шляхоў падыходу да вырашэньня гэтага пытаньня. Па-першае, гэта пошук і сістэматызацыя ўжо існуючай літаратуры; па-другое, выкарыстаньне нотнай літаратуры для 4-струннай домры; разам з тым неабходна рабіць пералажэньні для мандаліны з іншых нотных крыніц і, па-трэцяе, больш настойліва і мэтанакіравана прыцягваць беларускіх кампазітараў да стварэньня мандалліннай музыкі.

Шэраг прапаноў, якія датычаць нотнай літаратуры, выказала музыказнаўца прафесар БелАМ **К. Сьцепанцэвіч.** Што да рэпертуару, дык ужо зараз з дапамогай ратапрынтнай тэхнікі можна наладзіць раздрукоўку найбольш цікавых твораў для мандаліны непасрэдна ў Акадэміі. Па-другое, Асацыяцыі вельмі неабходна сваё выданьне. На першым часе гэта можа быць штоквартальны «Бюлетэнь» з апошняй інфармацыяй, які рассылаўся б ва ўсе абласныя метадычныя цэнтры. Пажадана таксама аформіць у выглядзе тэзісаў найбольш цікавыя даклады ўдзельнікаў канферэнцыі і выдаць іх, напрыклад, у сьпецыяльным часопісе «Пытаньні культуры». Каб больш шырока прапагандаваць домрава-мандалліннае выканальніцтва, вельмі дарэчы было б стварыць аркестр на базе Асацыяцыі. Акрамя таго, сьвежы подых у агульную справу маглі б унесьці сувязі з замежнымі арганізацыямі, клубамі аналагічнага тыпу ці калектывамі домрава-балалаечнага, мандаліннага складу.

Удзельнікі канферэнцыі выказалі заклапочанасьць тым, што, адраджаючы мандаліну, аддаючы ёй зараз перавагу, мы можам страціць ужо існуючыя набыткі ў галіне домравага выканальніцтва, а зараз яны ўражваюць, калі ўлічыць такіх вядомых выканаўцаў-дамрыстаў, як М. Марэцкі (пра яго часопіс «Мастацтва» пісаў), Л. Чарняк, А. Шоман, Ю. Валіцкі, А. Сакалоўская, С. Барэйка і інш. Каб не давялося нам праз дзесяць-дваццаць гадоў адраджаць домру, тым больш, што зараз сям-там ужо спрабавалі скараціць ці наогул закрыць прыём у ДМШ на домру. Многія выкладчыкі навучальных устаноў менавіта так і выказаліся: «Нас прыцясьняюць»... Гэткая заклапочанасьць дамрыстаў зразумелая, і ўзьнікла яна не без падстаў. Сёньня, як ніколі раней, мы павінны лічыцца з яе вялікасьцю канкурэнцыяй, якой прасякнуты ўсе сферы нашага жыцьця. Менавіта зараз ідзе канкурэнцыя жанраў, інструментаў, выканаўцаў. І ў гэтай барацьбе перамогуць больш моцныя, таленавітыя.

*Частка II*

## ГЭТА ТРЭБА ЧУЦЬ!

На заканчэньне канферэнцыі ў вялікай зале Філармоніі адбыўся канцэрт-прэзэнтацыя АБДМ, у якім прынялі ўдзел лепшыя калектывы домрава-балалаечнага і мандаліннага складу, а таксама асобныя салісты. З вялікім густам складзеная праграма канцэрта аб'яднала ўсіх прадстаўнікоў народнаінструментальнага жанру. На адной сцэне суіснавалі вельмі розныя, але аднолькава таленавітыя музыканты, якіх аб'ядналі натхненьне і творчы ўзьлёт.

Аркестр народных інструментаў «Менск» пад кіраўніцтвам Г. Новікава зусім малады і таму, напэўна, мала знаёмы шырокай публіцы. Пачуць яго было тым больш прыемна, што ён уразіў залу сваім майстэрствам. Гэта першы ў рэспубліцы калектыў камерцыйнага тыпу і першы прафесійны домрава-балалаечны аркестр, пра які даўно марылі. Вельмі цікава, па-народнаму «сакавіта», з ужываньнем элементаў тэатралізацыі, да якіх далучыўся нават дырыжор, прагучала гумарэска «Вясковыя музыкі» У. Помазава. У характэрным народнатанцавальным стылі была вытрымана «Кадрыля» Я. Глебава. Прагучаў і выдатны, незабыўна-страсны Э. Курціс («Non ti scodar di me») у выкананьні саліста ДАВТа Рыгора Палішчука, які ўразіў сваім цудоўным голасам і пранікнёнай эмацыянальнасьцю. Але самым дзівосным было выкананьне «Палёту чмяля» з оперы «Казка пра цара Салтана» М. Рымскага-Корсакава, які «праляцеў» з такой касьмічнай хуткасьцю і такой філігранна й тэхнікай, што зала ўзарвалася апладысьментамі і крыкамі «брава». І гэта, заўважце, на пачатку канцэрта.

Незвычайна сярод народнаінструментальных твораў прагучаў Канцэрт соль-мажор А. Вівальдзі для дзьвюх мандалін,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

струннага аркестра і аргана. Мабыць, толькі геній Вівальдзі мог спалучыць у адным творы гучаньне такіх розных інструментаў, як мандаліна і арган. Але, на жаль, мандаліны нават у руках такіх вядомых музыкантаў, як М. Марэцкі і Н. Ручымская, аказаліся крыху заглушанымі квартэтам «Забытыя мелодыі», нягледзячы на падгучваньне мікрафонаў. У Камернай зале (у памяшканьні касьцёла Сьвятога Роха) гэты твор гучыць непараўнальна лепш. Тым не менш вытанчаная мініяцюра Э. Мецакапа «Балеро», як заўсёды, гучала бліскуча.

На канцэрце панавалі не толькі домра з мандалінай. Свае прывітаньні і падтрымку высакароднай справе выказалі прадстаўнікі суседніх інструментальных жанраў, якія прынялі ўдзел у гэтым канцэрце. Адзін з іх — лаўрэат усесаюзнага конкурсу Актэт балалаек з Віцебска пад кіраўніцтвам заслужанай артысткі РБ Тамары Шафранавай. Гэта класічны ўзор народнаінструментальнага жанру і захавальнік жыхараўскіх традыцый. Колькі пяшчоты, дабрыні, сапраўды беларускага каларыту адчувалася ў творы І. Лучанка «Мой родны кут» (апрац. М. Прашко), колькі віртуознага майстэрства і маладзецкай зухаватасьці ў п'есах «Ай, усе кумкі» (апрац. А. Новікава) і «Валёнкі» (апрац. А. Шалава)!

На канцэрце зноў зіхацеў артыстызм адной з лепшых цымбалістак нашай краіны — лаўрэата міжнароднага конкурсу Л. Рыдлеўскай. Яна падаравала слухачам цудоўную фантазію У. Фралова на тэмы з оперы Д. Гершвіна «Поргі і Бес». А вось Менуэт В. Капыцько, напісаны для цымбалаў-сола, многім падаўся незразумелым з прычыны сваёй эксперыментатарскай навізны.

У апошні час у нашай рэспубліцы зьявіліся даволі арыгінальныя калектывы. Так, дуэт дамрыстак, лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу А. Шоман і А. Сакалоўскай, нягледзячы на маладосьць выканаўцаў, ужо пасьпеў заваяваць сімпатыі слухачоў і знайсьці сваіх прыхільнікаў, асабліва сярод тых, хто цікавіцца джазам. Гэты калектыў вызначаецца вельмі тонкім разуменьнем і выкананьнем менавіта джазавых кампазіцый, такіх, як Сюіта для дзьвюх домр і фартэпіяна А. Шпянёва. Выдатны дуэт арганічна дапаўнялі піяністка В. Карасёва і ўдарнік В. Кардаільскі.

Дзень канцэрта, 13 траўня, напэўна, увойдзе ў гісторыю нашай музычнай культуры не толькі як дзень прэзентацыі АБДМ, але і тым, што менавіта ў гэты дзень адбылося нараджэньне (а дакладней, адраджэньне) Неапалітанскага аркестра, які аб'яднаў у сваім складзе самых знакамітых музыкантаў. Узьнік гэты калектыў у выніку супрацоўніцтва Беларускага універсітэта культуры і БелАМ, дзякуючы творчаму саюзу Ларысы і Валерыя Жывалеўскіх. Трыпціх на беларускія тэмы В. Жывалеўскага, які кранае сваёй глыбокай нацыянальнай шчырасьцю, быў выкананы з вялікім натхненьнем і майстэрствам. Непаўторнае ўражаньне пакінулі таксама бліскучыя і багатыя па мове Інтрадукцыя і Фанданга італьянскага кампазітара Луіджы Бакерыні.

Узьнікненьне такога калектыву — гэта падзея, якую можна параўнаць з буйным навуковым адкрыцьцём. Такое спалучэньне тэмбраў (мандаліны, гітар, драўляных духавых інструментаў), такое дзівоснае гучаньне і хараство нават цяжка сабе ўявіць. Гэта трэба чуць!



Завяршыўся канцэрт выступленьнем добра вядомага не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой Аркестра народных інструментаў г. Маладзечна, якім кіруе таленавіты музыкант, заслужаны дзеяч культуры Р. Сарока. Пранікнёна, са сьветлым пачуцьцём прагучала п'еса «Настрой» В. Іванова. Даспадобы прыйшліся слухачу і дзьве жартоўныя беларускія песьні «Кума мая кумачка» і «Ой, ды ў нашым сяле свадзьба будзе» ў артыстычным выкананьні заслужанага артыста РБ В. Кучынскага і аркестра.

Ролю генеральнага спонсара канцэрта ўзяло на сябе СП «ТЕССО» — афіцыйны прадстаўнік Ульянаўскага аўтамабільнага завода ў РБ, спонсараў — рэгіянальна-камерцыйны банк «КОМПЛЕКС-БАНК», фірма М «Дах», а таксама Маладзечанскае музычнае вучылішча.

Скончыліся дэбаты, сьціхлі гукі цудоўных інструментаў, але хочацца спадзявацца, што добрая і патрэбная справа, распачатая Асацыяцыяй, знойдзе падтрымку нашага грамадства.

**Фота У. Вітчанкі.**

**За пультам — Ларыса Жывалеўская.**

РЕПОЗИТОРИЙ